10. *Міхневіч, А. Я.* Слоўка за слоўкам : алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх / А. Я. Міхневіч, Л. П. Кунцэвіч, Ю. В. Назарэнка. — Мінск, 2006.

11. *Пісарэнка, А. М.* Функцыянальная стылістыка беларускай мовы / А. М. Пісарэнка. — Мінск, 2003.

12. Пытанні культуры пісьмовай мовы / пад рэд. А. І. Падлужнага. — Мінск, 1991.

13. *Супрун, А. Е.* Нормы общения: речевой этикет / А. Е. Супрун // Лекции по теории речевой деятельности. — Минск, 1996. — С. 167—172.

14. *Сцяцко, П. У.* Культура мовы / П. У. Сцяцко. — Мінск, 2002.

15. *Цікоцкі, М. Я.* Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. — Мінск, 1995.

16. *Цікоцкі, М. Я.* Стылістыка тэксту / М. Я. Цікоцкі. — Мінск, 2002.

17. *Шумчык, Ф. С.* Функцыянальная стылістыка беларускай мовы / Ф. С. Шумчык. — Мінск, 2004.

18. *Юрэвіч, А. К.* Стылістыка беларускай мовы. — 2-е выд. / А. К. Юрэвіч. — Мінск, 1992.

19. *Юрэвіч, У. М.* Слова жывое, роднае, гаваркое... : дапам. для настаўнікаў / У. М. Юрэвіч. — Мінск, 1998.

20. *Янкоўскі, Ф. М.* Беларуская мова / Ф. М. Янкоўскі. — Мінск, 1978.

21. *Янкоўскі, Ф. М.* Само слова гаворыць / Ф. М. Янкоўскі. — Мінск, 1986.


БПУ + Р2 + 8(476)

**І. М. Гоўзіч,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта
імя Максіма Танка

# СТАРАЖЫТНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

## Праграма курса на выбар для IX класа

### Тлумачальная запіска

Праграма курса на выбар «Старажытная беларуская літаратура» заснавана на паглыбленні і пашырэнні асобных тэм базавай агульнаадукацыйнай праграмы па беларускай літаратуры для IX класа, а таксама вывучэнні некаторых новых тэм. Такім чынам, яна дапаўняе базавую праграму, не парушаючы яе цэласнасці.

Вывучаючы старажытную беларускую літаратуру, неабходна ўлічваць яе спецыфічныя рысы, што адрозніваюць яе ад сучаснай: рукапісны характар існавання і распаўсюджвання, ананімнасць; роля перапісчыкаў як рэдактараў і сааўтараў; сувязь слоўнага мастацтва з царкоўнай і дзелавой пісьменнасцю і фальклорам; пашыраная сфера яе ідэалагічнага ўздзеяння на людзей; героямі старажытнарускай літаратуры з'яўляюцца пераважна гістарычныя асобы. Усё гэта патрабуе ад настаўніка сур'ёзнай працы з тэкстам.

Старажытная беларуская літаратура непарыўна звязана з гісторыяй свайго народа, эпохі. На прыкладзе падабраных для вывучэння твораў трэба адлюстроўваць разнастайнасць мастацкіх жанраў (пропаведзі, павучэнні, жыціі, хаджэнні, словы, аповесці), вызначаць характар светасузірання чалавека эпохі Сярэднявечча, яго ўяўленні пра свет і чалавека ў ім, паказваць ролю і значэнне культурнай і літаратурнай спадчыны для духоўна-маральнага выхавання сучасных пакаленняў.

Мэта праграмы курса на выбар «Старажытная беларуская літаратура» — дапамагчы вучням больш шырока і грунтоўна засвоіць праграмны матэрыял, авалодаць методыкай літаратурнага аналізу, прасачыць заканамернасці і асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу старажытнага перыяду з улікам новых матэрыялаў, развіваць цікавасць школьнікаў да сваёй гісторыі і тых змен, якія адбываліся ў грамадстве на працягу многіх стагоддзяў.

Асноўныя задачы курса — даць вучням магчымасць рэалізаваць сваю цікавасць да прадмета; удакладніць гатоўнасць і здольнасць вучня засвойваць яго матэрыял на павышаным узроўні; паказаць гісторыка-літаратурную панараму пачатку XI — другой паловы XVIII стагоддзя; пазнаёміць вучняў з лепшымі дасягненнямі старажытнай літаратуры і новымі, амаль або зусім невядомымі імёнамі аўтараў і мастацкімі творамі, тым самым выхоўваючы ў іх цікавасць да пошуку, уменне думаць самастойна, даваць асобасныя адзнакі з'явам; зацікавіць школьнікаў мастацка значным тэкстам, развіць у іх пачатковыя навыкі прафесійнага аналізу твораў на некалькіх узроўнях: тэматычным, жанравым, вобразна-выяўленчым, кантэкстуальным.

На вывучэнне курса на выбар «Старажытная беларуская літаратура» адводзіцца 34 гадзіны.

Пералік твораў, пазначаных у праграме, можа карэктавацца настаўнікам у бок памяншэння ў залежнасці ад ступені падрыхтаванасці вучняў.

## Змест курса
(34 гадзіны)

### Уводзіны (*1 гадзіна*)

Задачы вывучэння гісторыі старажытнай беларускай літаратуры. Літаратурная спадчына беларускага народа. Праблема перыядызацыі старажытнай літаратуры. Узнікненне старажытнай літаратуры ўсходніх славян.

### I. ЛІТАРАТУРА СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ (*7 гадзін*)

Кіеўская дзяржава ў XI—XIII стагоддзях. Зараджэнне агульнаўсходнеславянскай літаратуры. Летапісанне. Падзел літаратуры на рэлігійную і свецкую. Агульныя асаблівасці літаратуры Кіеўскай Русі. Асноўная тэматыка, жанры, стылі. Роля Полацкага княства ў развіцці літаратуры і культуры.

### Перакладная літаратура (*1 гадзіна*)

Біблія як помнік сусветнай літаратуры. Апокрыфы і жыцці як жанры некананічнай царкоўна-рэлігійнай літаратуры.

Гістарычная проза (хроніка Георгія Амартала) і перакладная белетрыстыка.

### Арыгінальная літаратура (*6 гадзін*)

Жыццё як жанр літаратуры. «Жыццё Еўфрасінні Полацкай» — першае жыціе старабеларускай літаратуры. Шэсць рэдакцый «Жыція...». Вобраз асветніцы ў творы і сучаснай літаратуры.

*Кірыл Тураўскі* і яго роля ў развіцці аратарскай прозы. Красамоўства ў «Словах» асветніка. Помнікі, што дакладна належаць пяру святціцеля, і тыя, якія толькі прыпісваюцца яму (псеўдаэпіграфы). Велізарны аб'ем спадчыны аўтара XII стагоддзя, папулярнасць «рускага Залатавуста» сярод сучаснікаў. Прапаведзь маральнага самаўдасканалення чалавека ў творчасці Кірыла Тураўскага — пісьменніка, прапаведніка, царкоўна-палітычнага дзеяча, майстра аратарскай прозы.

*Летапіс «Аповесць мінулых часоў»*. Састаў, рэдакцыі, крыніцы. Ідэйна-мастацкія асаблівасці твора. Беларускія матывы ў старажытным помніку (князь Рагвалод, яго дачка Рагнеда, Брачыслаў і яго сын Усяслаў Чарадзей). Першыя князі Русі і этнічнай тэрыторыі Беларусі. Ацэнка дзеянняў Вольгі, Святаслава, Уладзіміра, Яраслава Мудрага і тураўскага князя Святаполка па хрысціянізацыі Русі ў творы.

*«Слова пра паход Ігаравы»* як шэдэўр сусветнай паэзіі эпохі Сярэднявечча. Гісторыя адкрыцця, апублікавання, вывучэння твора, праблема аўтарства. Рэальныя гістарычныя падзеі і іх адлюстраванне ў «Слове пра паход Ігаравы». Ідэйна-тэматычны змест, вобразная сістэма і мастацкія асаблівасці твора. Беларускія матывы ў помніку літаратуры Сярэднявечча. Сусветна-гістарычнае значэнне помніка.

## II. ЛІТАРАТУРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIV — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII СТАГОДДЗЯ (*23 гадзіны*)

### Станаўленне беларускай старажытнай літаратуры (*1 гадзіна*)

Узнікненне Вялікага княства Літоўскага. Фарміраванне беларускай народнасці і старабеларускай мовы. Афіцыйнае прызнанне старабеларускай мовы дзяржаўнай. Развіццё культуры эпохі Сярэднявечча.

### Беларуска-літоўскае летапісанне XIV—XV стагоддзяў (*3 гадзіны*)

*«Летапіс вялікіх князёў літоўскіх»* як крыніца пазнання далёкай мінуўшчыны Беларусі, адлюстраванне ў творы міжусобных войнаў. Дакументальна-гістарычная аповесць — неаднародны літаратурны помнік, у якім аб'яднаны творы розных аўтараў.

*«Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.»* — твор пра ўзнікненне Кіеўскай дзяржавы, жыццё і дзейнасць першых рускіх князёў ад Рурыка да Яраслава Мудрага. Адлюстраванне гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў творы.

Гісторыя Вялікага княства Літоўскага і яе адлюстраванне ў *«Хроніцы Быхаўца»*. Ваенна-патрыятычнае гучанне «Хронікі Быхаўца». Своеасаблівасць структуры і кампазіцыі твора.

### Беларуская літаратура перыяду Адраджэння і Рэфармацыі (*1 гадзіна*)

Перадумовы гуманізму на Беларусі. Агульная характарыстыка эпохі. Спецыфічныя асаблівасці Адраджэння і Рэфармацыі ў Беларусі. Развіццё культуры і літаратуры: традыцыйнае і новае.

### Жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны (*3 гадзіны*)

Біяграфія асветніка. Ф. Скарына — першадрукар. Грамадскія погляды і ідэалы Ф. Скарыны — мысліцеля-гуманіста, патрыёта, асветніка. Асветніцкі характар перакладаў Скарыны. Прадмова да ўсёй Бібліі, патрыятызм і гуманізм прадмоў Скарыны. Прадмовы да «Малой падарожнай кніжыцы» і «Прытчаў Саламона». Роля пасляслоўяў. Адносіны асветніка да рэлігіі, улады, закону, права, навук. Эстэтычныя ідэалы і мастацкая творчасць. Скарына як паэт і заснавальнік свецкай паэзіі.

### Жыццё і творчасць Міколы Гусоўскага (*3 гадзіны*)

Мікола Гусоўскі — адзін з буйных дзеячаў беларускай культуры эпохі Адраджэння. Жыццёвы і творчы шлях паэта. Паэма «Песня пра зубра», гісторыя напісання і літаратурнае жыццё твора. Жанравая спецыфіка, кампазіцыя і структура «Песні пра зубра». Вобраз аўтара ў паэме. Асноўныя вобразы, праблемы і ідэі твора: праблема свабоды мастака і мастацтва, вобраз зубра і праблема трагічнага ў паэме, вобраз вялікага князя літоўскага Вітаўта як ідэал дзяржаўнага ўладара. Праблемы вайны і міру, жыцця і смерці, нацыянальнага адраджэння як цэнтральныя ў паэме.

### Дзеячы Рэфармацыі (*3 гадзіны*)

Агульная характарыстыка плыняў рэфармацыйнага руху ў Беларусі XVI стагоддзя. Літаратура перыяду Рэфармацыі.

*Сымон Будны* (*2 гадзіны*). Біяграфія і творчасць Буднага як рэфармацыйнага дзеяча, асветніка, гуманіста, філосафа, філолага, гісторыка. Рэлігійныя погляды С. Буднага і іх адлюстраванне ў кнігах на беларускай мове («Катэхізіс»). Літаратурнае майстэрства і перакладчыцкі талент асветніка.

*Васіль Цяпінскі* (*1 гадзіна*). Асноўныя біяграфічныя звесткі, культурна-асветніцкая дзейнасць рэфарматара. В. Цяпінскі — прадаўжальнік гуманістычных і культурна-асветніцкіх ідэй Ф. Скарыны. Пераклад на беларускую мову «Евангелля».

### Літаратура эпохі Барока і Асветніцтва (*1 гадзіна*)

Агульная характарыстыка перыяду. Узнікненне Рэчы Паспалітай. Роля праваслаўных царкоўных брацтваў у культурна-асветніцкім развіцці Беларусі. Беларусь і Украіна пасля Люблінскай (1569) і Брэсцкай (1596) уній.

### Царкоўна-палемічная публіцыстыка (*2 гадзіны*)

*Мялецій Сматрыцкі.* Асноўныя звесткі аб жыцці і творчасці асветніка. «Трэнас» (1610) — найбольш значны твор М. Сматрыцкага. Перадгісторыя ўзнікнення твора, яго роля і значэнне ў нацыянальна-вызваленчым руху. Навукова-педагагічная дзейнасць асветніка («Граматыка»).

*Афанасій Філіповіч.* Асноўныя біяграфічныя звесткі. «Дыярыуш» (1644) — выдат-

ны помнік палемічнай літаратуры, яго гістарычнае значэнне. Эмацыянальнасць вобразнасць твора.

### Гісторыка-мемуарная літаратура (*2 гадзіны*)

*Філон Кміта-Чарнабыльскі.* Адлюстраванне ў «Лістах» Ф. Кміты-Чарнабыльскага гістарычных падзей другой паловы XVI стагоддзя. Ацэнка палітычнага і эканамічнага жыцця Маскоўскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай у творы.

*Фёдар Еўлашоўскі.* Адлюстраванне побыту дробнай шляхты Беларусі ў «Дзённіку». Асоба аўтара ў мемуарах. Мастацкія вартасці і мова твора.

*Баркулабаўская хроніка.* Час узнікнення твора. Праблема аўтарства. Паказ мясцовага жыцця канца XVII — пачатку XVIII стагоддзя. Дэмакратызм твора.

### Свецкая сатырычная літаратура XVI—XVII стагоддзяў (*2 гадзіны*)

*«Прамова Мялешкі»* (1589). Творчая гісторыя помніка. Пратэст супраць палітычнага гвалту і эканамічнай экспансіі ў творы. Папулярнасць у XVII—XVIII стагоддзях.

*«Ліст да Абуховіча»* (1655). Выкрыццё амаральнасці і прадажнасці службовай шляхты ў творы. Асуджэнне бяздарнасці военачальнікаў, несумленнага выканання імі сваіх абавязкаў, здрадніцтва. Народна-размоўныя элементы ў творы.

### Паэзія XVI—XVII стагоддзяў (*2 гадзіны*)

*Андрэй Рымша.* Творы паэта на старабеларускай мове («Храналогія», 1581; панегірыкі на гербы магнатаў). Творчасць на польскай мове: паэма «Дэкатэрас», адлюстраванне ў ёй рэальных падзей часоў Лівонскай вайны. Вобраз Крыштафа Радзівіла і Стэфана Баторыя.

*Сімяон Полацкі.* Асноўныя звесткі аб жыцці і творчасці. Літаратурна-грамадская дзейнасць Сімяона Полацкага. Характарыстыка беларускага перыяду творчасці. Сімяон Полацкі як выдатны паэт барока. Яго роля ў гісторыі развіцця беларускай літаратуры.

## III. ЛІТАРАТУРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVII — XVIII СТАГОДДЗЯ (*2 гадзіны*)

Агульная характарыстыка перыяду. Узнікненне тэатра на Беларусі і яго віды. Народны (скамарохі, батлейка) і школьны тэатр. Узнікненне прафесійнага і прыдворнага тэатраў. Драматургія XVIII стагоддзя.

Міхаіл Цяцерскі. «Доктар па прымусу». Агульная характарыстыка п'есы.

«Камедыя» К. Марашэўскага як аснова айчыннай прафесійнай драматургіі. Асноўныя ідэі, вобразы, кампазіцыя драмы. Мова твора.

Тэатр Тызенгаўза ў Гродна. Беларуская інтэрмедыя. Яе сувязь са школьнай драмай.

### Заключэнне (*1 гадзіна*)

Абагульненне вывучанага пра асноўныя тэндэнцыі ў беларускай старажытнай літаратуры.

Правядзенне выніковай чытацкай канферэнцыі.

### Прагназуемыя вынікі

У працэсе навучання вучні павінны авалодаць наступнымі *ведамі*:

- асноўныя этапы і заканамернасці развіцця старажытнай беларускай літаратуры;
- сутнасць і характэрныя асаблівасці асноўных мастацкіх сістэм (адраджэнне, барока, класіцызм, асветніцтва);
- найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, творчасць якіх вывучаецца манаграфічна;
- змест, праблематыка, сістэма вобразаў, сюжэт і кампазіцыя асноўных вывучаных твораў, іх канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне.

У працэсе авалодання ведамі выпрацоўваюцца наступныя *уменні* вучняў:

- самастойна працаваць з мастацкімі тэкстамі і крытычнай літаратурай;
- рыхтаваць рэфераты, водгукі на прачытаныя творы, правільна афармляць іх структурныя часткі, бібліяграфію і цытаты;
- канспектаваць лекцыі настаўніка і выступленні аднакласнікаў;
- даваць самастойную ацэнку прачытаным творам і абгрунтоўваць яе, выяўляць характэрныя родавыя і жанравыя, стылёвыя асаблівасці вывучаных твораў;
- суадносіць веды пра гістарычную эпоху з падзеямі, адлюстраванымі ў творы;
- працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па вызначанай тэме (літаратурна-крытычныя артыкулы, слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі і інш.).

### Рэкамендаваная літаратура


1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII стагоддзя / падрыхт. А. І. Богдан [і інш.]; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. — Мінск, 2003.
2. *Арлоў, У.* Еўфрасіння Полацкая / У. Арлоў. — Мінск, 1992.
3. *Булахов, М. Г.* «Слово о полку Игореве» в литературе, искусстве, науке / М. Г. Булахов. — Минск, 1989.
4. *Вайтовіч, Н. Т.* Баркулабаўскі летапіс / Н. Т. Вайтовіч. — Мінск, 1977.
5. *Галенчанка, Г. Я.* Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. — Мінск, 1998.
6. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. / рэдкал. : У. І. Няфёд (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 1983. — Т. 1 : Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 г.
7. Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў : у 2 т. — Мінск, 2006. — Т. 1 : Даўняя літаратура: XI — першая палова XVIII стагоддзя / навук. рэд. В. А. Чамярыцкі.
8. Гісторыя беларускай літаратуры: старажытны перыяд / пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. — 2-е выд., дапрац. — Мінск, 1996.
9. Гравюры Францыска Скарыны. — Мінск, 1972.
10. *Дварчанін, І.* Францыск Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве / І. Дварчанін. — Мінск, 1991.
11. *Дорошкевич, В. И.* Новолатинская поэзия Литвы и Беларуси / В. И. Дорошкевич. — Минск, 1979.
12. *Кавалёў, С. В.* Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст. / С. В. Кавалёў. — Мінск, 1993.
13. *Каўка, А.* Тут мой народ: Ф. Скарына і беларуская літаратура XVI — пачатку XX ст. / А. Каўка. — Мінск, 1989.
14. *Конан, У.* Боская і людская мудрасць (Ф. Скарына) / У. Конан. — Мінск, 1990.
15. *Короткий, В. Г.* Творческий путь Мелетия Смотрицкого / В. Г. Короткий. — Минск, 1987.
16. *Лойка, А. А.* Старабеларуская літаратура / А. А. Лойка. Мінск, 2001.
17. *Майхровіч, С. К.* Слова пра паход Ігаравы / С. К. Майхровіч. — Мінск, 1968.
18. *Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя / А. Мальдзіс. — Мінск, 1982.
19. *Мальдзіс, А. І.* На скрыжаванні славянскіх традыцый: літ. Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII — XVIII ст.) / А. Мальдзіс. — Мінск, 1980.
20. *Мальдзіс, А.* Таямніцы старажытных сховішчаў / А. Мальдзіс. — Мінск, 1974.
21. *Мельнікаў, А. А.* Кірыл, епіскап Тураўскі / А. А. Мельнікаў. — Мінск, 1997.
22. *Немировский, Е. Л.* Франциск Скорина: жизнь и деятельность белорус. просветителя / Е. Л. Немировский. — Минск, 1990.
23. *Падокшын, С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. А. Падокшын. — Мінск, 1990.
24. *Парэцкі, Я. І.* Міхаіл Карыцкі / Я. І. Парэцкі. — Мінск, 1993.
25. *Парэцкі, Я. І.* Сымон Будны / Я. І. Парэцкі. — Мінск, 1975.
26. *Порецкий, Я. И.* Николай Гусовский / Я. И. Порецкий. — Минск, 1984.
27. *Саверчанка, І. В.* Старажытная паэзія Беларусі / І. В. Саверчанка. — Мінск, 1992.
28. Скарына і яго эпоха / В. А. Чамярыцкі [і інш.]; рэд. В. А. Чамярыцкі. — Мінск, 1990.
29. Старажытная беларуская літаратура : зб. / уклад. Л. С. Курбека. — Мінск, 1996.
30. *Тарасаў, К.* Памяць пра легенды / К. Тарасаў. — Мінск, 1994.
31. *Усікаў, Я.* Беларуская камедыя / Я. Усікаў. — Мінск, 1979.
32. Францыск Скарына і яго час : энцыкл. даведнік / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 1988.
33. *Чамярыцкі, В. А.* Беларускія летапісы як помнікі літаратуры / В. А. Чамярыцкі. — Мінск, 1969.
34. *Чамярыцкі, В.* Неўміручая песня Старажытнай Русі / В. Чамярыцкі // Слова пра паход Ігаравы. — Мінск, 1996. — С. 5—16.
35. *Чаропка, В.* Імя ў летапісе / В. Чаропка. — Мінск, 1994.
36. *Яскевіч, А. А.* Творы Ф. Скарыны: жанравая структура, філасофскія погляды, мастацтва слова / А. А. Яскевіч. — Мінск, 1995.